УДК 338.48:502

Н. І. Здановіч, ст. выкл. (БДТУ, г. Мінск)

# ВЫКАРЫСТАННЕ МАЛЫХ ЖАНРАЎ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ПРЫРОДАЗНАЎЧЫХ ЭКСКУРСІЙ

У формах народнай культуры заключана ўся ўнікальнасць этнічнага светапогляду, светаўспрымання, якія і робяць этнасы непадобнымі адзін да другога.

У этнаграфічным турызме замацавалася традыцыя выкарыстання мясцовага фальклору, “народнай дэманалогіі” для стварэння праграм фестываляў і традыцыйных святаў. Аднак у экскурсійнай дзейнасці недаравальна абыходзяць малыя жанры фальклору. Да іх адносяцца прыслоўі, пагаворкі, прыкметы, загадкі, выслоўі (пажаданні і праклёны). Гэтым жанрам уласцівы трапнасць выразаў, афарыстычнасць і сцісласць формы. У іх адлюстроўваюцца кемлівасць, дасціпны гумар і творчая фантазія народа.

Папулярнай формай правядзення экскурсій у апошняе дзесяцігоддзе сталі экскурсіі з элементамі квэст-гульні. З усіх пералічаных малых жанраў найбольш прыдатнымі для распрацоўкі квэст-гульні, прыкладам, на экалагічнай сцежцы, з’яўляюцца загадкі. Яны выконвалі і выконваюць наступныя функцыі: пазнавальную (спрыяюць актывізацыі пазнання свету, асабліва ў дзяцей), развіваючую (развіваюць назіральнасць, лагічнае мысленне), забаўляльную (таму што ў іх есць элементы гумару, а варыянты адказаў ажыўляюць аудыторыю), мастацкую (садзейнічаюць фарміраванню у человека вобразнага мыслення).

У традыцыйным грамадстве загадкі былі адным з этапаў выпрабаванняў кемлівасці, ведаў (прыкладам, пры прыняцці ў род, або як адно з выпрабаванняў жаніха падчас вяселля). Менавіта гэтыя яе функцыі прыдадуцца і на экскурсіі па экасцежцы з загадкамі па адпаведнай тэматыцы.

У залежнасці ад аудыторыі, можна ўжываць розныя па складанасці загадкі: для малодшых школьнікаў – загадкі-пытанні: (“Што бяжыць без повада?” (вада), “Што расце без кораня?” (камень), “Ні ног ні рук не мае, а яблыкі страсае” (вецер), “Дыхае, расце, а хадзіць не можа” (трава), “Рук многа, а нага адна” (дрэва) і г. д.).

Больш складаныя – метафарычныя загадкі – прыдадуцца і для дарослай аўдыторыі: “Зяленая – а не луг, белая – а не снег, кучаравая, а без валасоў”, ці “Кроў маю п’юць, косці мае паляць, маімі рукамі адзін аднаго б’юць” (бяроза); “Стаіць у бары, маршчынкі на кары, галінкі

пустыя, лісты разразныя" (клён); "Вясна прыгрэе – шубу надзене; зіма наступае – шубу скідае" (лісцевыя дрэвы); "Усе паны паскідалі жупаны, толькі трое ў жупанах стаяць" (сасна, елка, ядловец зімой). Экскурсавод павінен мець у запасе падказкі, каб дапамагчы правільна разгадаць загадку.

На экасцежцы з квэст-гульнёй разгадка можа быць умовай пераходу да наступнага этапу, або падказкай месца, дзе схавана наступнае заданне.

Для дзіцячай аўдыторыі на звычыйнай экскурсіі разгадкі дадуць права на накапленне выніковых балаў да канца экскурсіі і атрыманне прыза.

Загадкі могуць выкарыстоўвацца і ў якасці варыянтаў лагічных пераходаў на экскурсійным маршруце. Прыкладам, на экасцежцы "Казка Негарэльскага лесу" пры пераходзе са стаянкі "Мядзвежы куток" да стаянкі "Каменная казка" прапануецца адгадаць, пра што будзе размова, праз загадку: "Жыве доўга – цэлы век, есці не просіць, бо не чалавек" (камень). Пры пераходзе да наступнай стаянкі прапануецца загадка: "У адным доме сотні жыхароў, а сям'я адна" (вуллі). Пры пераходзе ў дэндрапарк можна агучыць загадку: што гэта і дзе яно жыве, што "цела не мае,без языка гаворыць, і ўсе яго чуюць" (рэха). Адпаведныя загадкі ў розных варыянтах можна падабраць для перахода да кожнай стаянкі і выкарыстоўваць пры гэтым прынцып дыферэнцыраванага падыходу да экскурсійнай аўдыторыі.

Аграсядзібы – яшчэ адна тэрыторыя, цалкам прыдатная для правядзення экскурсій: не толькі этнаграфічных, але і прыродазнаўчых. Яшчэ ў 2014 г. у Беларусі іх было больш 2 тысяч. Акрамя звыклага ўжо месца для правядзення традыцыйных святаў з абрадамі і часам міфалагічнымі персанажамі ў якасці аніматараў, гаспадары аграсядзібаў звычайна прапануюць для наведвальнікаў традыцыйную кухню. Аднак кола паслуг можна было б пашырыць за кошт невялікіх экскурсій па гаспадарцы (для знаёмства з традыцыйнымі агароднымі культурамі і хатняй жывёлай, што зацікавіць у першую чаргу гарадскіх школьнікаў).

Фальклор Беларусі назапасіў шмат загадак, прыслоўяў і прыкмет з зашыфраванымі ў іх ведамі нашых продкаў пра культурныя расліны. Выкарыстоўваючы іх, можнаператварыць экскурсію ў квэст-гульню па аналогіі з экскурсіяй па экасцежцы, прапануючы праз адгадкі знаходзіць адпаведную расліну і запомніць самыя цікавыя яе ўласцівасці: "Сядзіць пані ў зяленым жупані, хто яе ўбача, той заплача"(цыбуля); "Тоўста наша маці, у яе лата на лаце" (капуста); "Хоць і красна, ды не дзеўка, хоць з хвастом, ды не мыш" (бурак); "На

двары зялены, а ў хаце – салёны”; “На градцы доўгі і зялёны, а ў хаце жоўты і салёны” (гурок); “Сядзіць красавіца ў цямніцы, а каса на вуліцы” (морква). Цікавую загадку можна знайсці  практычна пра кожную расліну.

Пры неспрыяльным надвор’і ці ўзімку міні-экскурсію можна правесці ў хаце, дзе плады дбайнай працы гаспадароў будуць падрыхтаваныя ў якасці экспанатаў. Да іх можна дадаць і зерневыя культуры, а таксама пазнаёміць з прадметамі інтэр’ера і іх назвамі. У такім выпадку экскурсія з прыродазнаўчай ператворыцца ў этнаграфічную. Пры гэтым пачынаць трэба з самага важнага элемента інтэр’ера, без якога не абыходзіцца ні адна хата – з печы. Прыкладам, даволі складана расшыфраваць, што маецца на ўвазе ў загадцы “Бабка-таўстуха, матка-краснуха, а сынок Філімон вільнуў – ды вон”? Альбо пра што і чаму гаворыцца ў наступнай загадцы: “Адзін кажа – світай, божа; другі кажа – не дай божа, а трэйці кажаць – а мне ўсёроўна” (ложак, дзверы, вокны). І што “у агні мокне, у вадзе сохне”?

Не меньш цікавыя загадкі пра мэблю: “Чатыры брацікі пад адным капелюшом стаяць” (стол); “У лесе было, лісце мела, цяпер трымае душу і цела” (ложак); “Многа ў сябе хаваець, а сама на віду” (шафа); “Што за рэч паглядзіш на яе – сябе ўбачыш”.

На завяршэнне можна прапанаваць загадкі-жарты, блізкія да вызначанай экскурсаводам тэмы, ці загадкі з выхаваўчай канатацыяй.

Такім чынам, загадкі, як адна з малых жанраў  фальклору любога народа, з’яўляюцца адной з незатратных крыніц пашырэння ведаў, экскурсійнага патэнцыялу тэрыторыі, пазнання душы народа, асэнсавання трываласці і каштоўнасці ведаў, назапашаных нашымі продкамі.  Аркамя таго, загадкі, як і іншыя малыя жанры фальклору, маюць не толькі выхаваўчае і адукацыйнае значэнне, але і вялікі патэнцыял для распрацоўкі інтэрактыўных экскурсій розных тыпаў практычна для ўсіх узроставых катэгорый.

ЛІТАРАТУРА

1. Загадкі /НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Склад. М.Я. Грынблат, А.Я Гурскі. – 2-е выд. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 363 с.